# Сусветная гісторыя кнігі разгортваецца ў экспазіцыі музея

1 верасня Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адзначыў 15-годдзе. У ім можна прасачыць сусветную гісторыю з'яўлення кнігі і іншых інфармацыйных носьбітаў. Тут ёсць клінапісныя таблічкі, папірусы, скрутак старажытнай Торы, кнігі ранняга перыяду еўрапейскага кнігадрукавання - інкунабулы.




У музеі захоўваюцца беларускія старадрукі XVI-XVIII стагоддзяў, выдадзеныя ў друкарнях Вільні, Берасця, Нясвіжа, Куцейны і іншых гарадоў, славянскія рукапісныя багаслужбовыя кнігі, Евангеллі з каляровымі ілюстрацыямі, рукапісныя кнігі на ўсходніх мовах, кітабы, Каран.




Асобае пачэснае месца ў музеі займаюць кнігі Францішка Скарыны і факсімільныя копіі яго выданняў у 21-томным зборы "Кніжная спадчына Францыска Скарыны", выпушчаным да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў 2017 годзе.



У Музеі знаходзяцца самыя аб'ёмныя і вялікія кнігі, і маленькія сувенірныя выданні твораў А. Пушкіна, А. Міцкевіча, Я. Купалы і Я. Коласа. Самая ёмістая кніга з прадстаўленых тут была выдадзена ў 1610 годзе ў Маскве. Самым вялікім экспанатам Музея з'яўляецца ілюстраваная праца амерыканскага арнітолага, якая пабачыла свет у 1972 годзе. Тут экспануюцца зараз французскія суперэкслібрысы, размешчаныя на каралеўскіх кнігах XVIII стагоддзя.




Асобная частка экспазіцыі прысвечана гісторыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая будзе хутка адзначаць 100-годдзе. У ёй прадстаўлены партрэт першага дырэктара бібліятэкі Іосіфа Бенцыянавіча Сіманоўскага і ветэранаў бібліятэкі, расказваецца пра гісторыю стварэння праекта архітэтарам Вінаградавым, і пра будаўніцтва сучаснага будынка, сімвалічны ключ ад якога быў уручаны ў 2006 годзе.

У Музеі кнігі пастаянна праводзяцца экскурсіі для навучэнцаў школ, каледжаў і ВНУ Менска і іншых гарадоў рэспублікі. Тут у 2019 годзе дзейнічала маштабная выстава "Беларусь і Біблія", у цэнтры ўвагі якой была гісторыя стварэння Кнігі Кніг. Яна прыцягнула каля 30 000 наведвальнікаў з розных куткоў Беларусі.

У Музеі кнігі рэгулярна праходзяць заняткі з маленькімі наведвальнікамі ў межах "Клуба кніжных прафесараў", які вядзе Таццяна Андрэеўна Сапега. Да юбілею Музея абвешчаны конкурс празаічных, паэтычных і мастацкіх твораў юных чытачоў, які будзе доўжыцца з 1 верасня па 17 кастрычніка.

*Э. Дзвінская,*
*фота аўтара.*